# НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

## «РУНЬ ПРА СЕЙБІТА РАСКАЖА…»: ДА 70-ГОДДЗЯ ПРАФЕСАРА ВАСІЛЯ ДЗЯНІСАВІЧА СТАРЫЧОНКА



24 лютага 2024 г. свой 70-гадовы юбілей з дня нараджэння адзначыў вядомы беларускі лінгвіст доктар філалагічных навук, прафесар, дэкан філалагічнага факультэта БДПУ Васіль Дзянісавіч Старычонак.

Жыццёвы шлях Васіля Дзянісавіча пачаўся ў невялікай вёсцы Луцішча на Крупшчыне. Бацькі будучага вучонага былі звыклыя да цяжкай сялянскай працы, пасляваеннай нястачы і патрэбы выжываць з разлікам толькі на ўласныя сілы. Відаць, працавітасць Дзяніса Ермалаевіча і Лукер'і Мінаўны перадалася па спадчыне і іх семярым дзецям. Малодшы сын Васіль з самага дзяцінства быў навучаны працаваць на гаспадарцы, даглядаць жывёлу, добра спраўляўся з касой і ўмеў абрабляць зямлю.

Да 1971 г. Васіль Дзянісавіч вучыўся ў Абчугскай сярэдняй школе. Пазней ён успамінаў, як класе ў дзявятым, седзячы на печы, доўгімі зімовымі вечарамі сачыняў нататкі ў раённую газету «Ленінскім курсам» – пра землякоў, пра розныя школьныя мерапрыемствы і многае іншае.

У студэнцкія гады будучы прафесар праявіў сябе як удумлівы і ў той жа час актыўны малады чалавек з добрым адчуваннем слова і філалагічным складам мыслення. Вучоба на філфаку БДУ давалася Васілю Дзянісавічу лёгка. Разам з ім на курсе вучыліся і іншыя вядомыя ў будучым асобы: лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, заслужаны дзеяч культуры Беларусі Мікола Мятліцкі, журналіст і пісьменнік, аўтар некалькіх паэтычных зборнікаў Алесь Жыгуноў, літаратар і педагог Іван Рубін, паэт Анатоль Шушко і інш. Ды і выкладчыкі падабраліся салідныя. На патоку чытала лекцыі цэлая кагорта вядомых вучоных: Н. С. Гілевіч, В. П. Рагойша, А. Я. Супрун, М. Р. Ларчанка, Л. І. Бурак, М. А. Паўленка і многія іншыя. Вучыцца было ў каго.

Усе пяць гадоў студэнцтва Васіль Старычонак быў старастам групы, прымаў удзел у маладзёжным руху, адказваў за арганізацыю будаўнічых атрадаў і на працягу трох змен выязджаў у далёкі Слабадзейскі раён Малдовы ў якасці камандзіра летняга будаўнічага атрада «Мара».

Пасля заканчэння з адзнакай філфака БДУ малады спецыяліст з верасня 1976 г. быў залічаны навуковым супрацоўнікам у сектар дыялекталогіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Акадэміі навук Беларусі.

Васіль Дзянісавіч адразу ўключыўся ў працу сектара над сістэматызацыяй і вывучэннем беларускіх гаворак паўночнага захаду Беларусі. У 1977 г. ён у складзе экспедыцый збіраў лексіку на Астравеччыне і Браслаўшчыне. Выязджаў таксама на тэрыторыю Літвы – у Вільнюскі, Шальчынінскі і Даўгаўпілскі раёны.

Вынікам працы навуковага калектыву стала публікацыя пяцітомнага «Слоўніка беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча» (1979–1986). Васіль Дзянісавіч у ім з'яўляецца аўтарам некалькіх соцень слоўнікавых артыкулаў на амаль 250 старонках.

Новы аспірант атрымаў і ўласную тэму, таксама звязаную з дыялекталогіяй, – «Найменні транспартных сродкаў і вупражы ў беларускіх народных гаворках» – і выконваў яе пад кіраўніцтвам доктара філалагічных навук Ю. Ф. Мацкевіч. Даследчыку патрэбна было зрабіць нямала. Перш за ўсё, скласці праграму па збіранні найменняў беларускіх традыцыйных транспартных сродкаў і назваў вупражы. Потым у палявых умовах трэба было апрабіраваць праграму і сабраць адпаведную лексіку, выбраць матэрыял з разнастайных друкаваных крыніц, сістэматызаваць і прааналізаваць сабраныя моўныя адзінкі.

Падчас працы над дысертацыяй упершыню для навуковай супольнасці праявіліся такія рысы В. Д. Старычонка, як руплівасць, стараннасць, сканцэнтраванасць і ўменне працаваць нават у неспрыяльных умовах. У выніку за кароткі тэрмін была напісана работа, у якой выяўляліся, дэманстраваліся

і тлумачыліся асноўныя адрозненні ў назвах транспартных сродкаў і вупражы на ўзроўні фанетыкі, акцэнталогіі, марфалогіі і семантыкі, адзначаліся найбольш тыповыя і прадуктыўныя спосабы і мадэлі ўтварэння вылучаных назваў.

Аб'ёмістая – амаль 440 старонак – дысертацыя была паспяхова абаронена ў савеце пры Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа 18 красавіка 1980 г.

Паралельна з працай над «Слоўнікам беларускіх гаворак…» і кандыдацкай дысертацыяй В. Д. Старычонак удзельнічаў у збіранні і апрацоўцы матэрыялу для пяцітомнага «Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак» (1993–1998). Для гэтага праекта ён падрыхтаваў 112 лінгвагеаграфічных картаў (некаторыя з іх у суаўтарстве).

Пасля паспяховай абароны і зацвярджэння вучонай ступені былы першы апанент прафесар А. П. Груцо ў канцы сакавіка 1982 г. запрасіў маладога вучонага працаваць на сваю кафедру ў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя Максіма Горкага. З таго часу лёс В. Д. Старычонка звязаны з нашым універсітэтам.

Найбольш плённымі для вучонага былі 1990-я гады. У 1991 г. выйшла яго першае асабістае лексікаграфічнае выданне – «Слоўнік амонімаў беларускай мовы». Слоўнік уключае каля 2 тыс. слоўнікавых артыкулаў, кожны з якіх змяшчае пары ці групы амонімаў з шырока разгалінаванай сеткай значэнняў. У корпус слоўніка ўваходзяць дзве часткі: асноўная, якая складаецца з аманімічных пар і груп амонімаў беларускай мовы, і частка, у якой прыводзяцца функцыянальныя амонімы, утвораныя шляхам субстантывацыі. Слоўнік аказаўся ўдалым і запатрабаваным. Пасля яго выхаду рознымі аўтарамі неаднаразова рабіліся спробы апісаць амонімы беларускай мовы, але іншыя выданні атрымліваліся значна больш сціплымі па памерах і колькасці адлюстраванай лексікі або скапіраванымі са слоўніка В. Д. Старычонка.

Васіль Дзянісавіч актыўна ўдзельнічаў у стварэнні серыі калектыўных вучэбных дапаможнікаў пад рэд. І. А. Кісялёва для студэнтаў педагагічных інстытутаў: «Современный русский язык: Лексикология. Фразеология. Лексикография. Фонетика. Орфоэпия. Графика. Орфография» (1990), «Современный русский язык: Словообразование. Морфология» (1992), «Современный русский язык: Синтаксис. Пунктуация» (1994), а пазней і сам кіраваў шматлікімі навуковымі калектывамі. У гэты ж час з'явіўся шэраг яго аўтарскіх дапаможнікаў па беларускай і рускай філалогіі: «Лінгвістычныя аналізы» (1997), «Основы фонологии» (у суаўт.; 1998), «Русский язык: лингвистические анализы» (1999), «Беларуская мова: Узоры моўнага аналізу. Трэніровачныя заданні. Тэсты» (2002), лінейка выданняў для школьнікаў і абітурыентаў па беларускай літаратуры. Выключна папулярным стаў дапаможнік «Беларуская літаратура» (1993), у якім выкладаліся агульныя патрабаванні да вуснага экзамену па беларускай літаратуры, даваліся метадычныя парады абітурыентам, лаканічны і даступны агляд літаратуры эпохі Сярэднявечча, Рэнесансу, XVII–XX стст., а таксама сучаснай паэзіі, прозы і драматургіі.

У 1995 г. В. Д. Старычонак пайшоў на эксперымент і падрыхтаваў дапаможнік з творчай назвай «Ах, сачыненні, сачыненні...» (2-е выд. 1996; 3-е выд. 1997). Кніга таксама аказалася паспяховай: у гэты час практычна адсутнічала метадычная літаратура для падрыхтоўкі да сачыненняў, а сціслых звестак са школьных падручнікаў навучэнцам, відавочна, не хапала.

За кароткі час Васіль Дзянісавіч апублікаваў і яшчэ шэраг выданняў такога плану. Прычым, з кожным новым выданнем кнігі дапрацоўваліся, удасканальваліся і пашыраліся. Убачылі свет дапаможнікі «50 новых сачыненняў па беларускай літаратуры» (1997; 2-е выд. 2002), «55 сачыненняў па беларускай літаратуры» (1997; 2-е выд. 2002), «100 сачыненняў па беларускай літаратуры» (1998; 2-е выд. 1999; 3-е выд. 2002; 4-е выд. 2004), «150 сачыненняў па беларускай літаратуры» (1999), «155 сачыненняў па беларускай літаратуры» (2000; 2-е выд. 2001) і інш.

Нечаканым, арыгінальным і таму запатрабаваным дапаможнікам стала кніга В. Д. Старычонка «Займальная філалогія» (1997), мэта якой – паглыбленне і ўдасканаленне ведаў па курсах мовы, літаратуры, паўтор і замацаванне пэўных тэм, папярэджанне і выпраўленне арфаграфічных памылак, узбагачэнне слоўнікавага запасу, набыццё навыкаў работы з філалагічнай літаратурай.

Васіль Дзянісавіч знаходзіў час і для акадэмічнай навукі. Так, у 1997 г. у выдавецтве БДПУ была апублікавана яго манаграфія «Полісемія ў беларускай мове (на матэрыяле субстантываў)» – грунтоўнае і цэласнае даследаванне лексічнай мнагазначнасці ў беларускай лінгвістыцы. Манаграфія стала першай спробай змадэляваць семантычны фрагмент моўнай сістэмы, важным крокам да асэнсавання семантычнай варыятыўнасці ў цеснай яе сувязі з лінгвістычнымі і пазалінгвістычнымі фактарамі. На падставе гэтай кнігі В. Д. Старычонак падрыхтаваў доктарскае даследаванне, якое паспяхова абараніў 30 студзеня 1998 г.

Пасля зацвярджэння ВАКам 44-гадовы доктар філалагічных навук у снежні 1998 г. быў абраны прафесарам кафедры рускай мовы, а з ліпеня 2001 г. заняў пасаду дэкана факультэта рускай філалогіі БДПУ. З таго часу Васіль Дзянісавіч ужо на працягу амаль чвэрці стагоддзя стаіць на чале ўсяго складанага і шматэтапнага працэсу падрыхтоўкі настаўнікаў-філолагаў у краіне. Ён з'яўляецца членам і старшынёй шэрагу камісій, бюро і прэзідыумаў, без яго ўхвалення не зацвярджаюцца вучэбныя планы і не грыфуюцца падручнікі. Але нязменным застаецца тое, што нягледзячы на вялікую адміністрацыйную загружанасць, ён знаходзіць час для чытання лекцый, выдання вучэбных дапаможнікаў, укладання слоўнікаў і напісання манаграфій.

На працягу ўсяго перыяду працы на пасадзе дэкана В. Д. Старычонак шмат сіл аддае падрыхтоўцы вучэбных дапаможнікаў па рускай мове для беларускіх студэнтаў. Фактычна палова ўсёй вучэбнай літаратуры, якая друкавалася ў 2000-я гады па рускай лінгвістыцы ў Беларусі, выходзіла з удзелам Васіля Дзянісавіча. Відаць, найбольш значным дасягненнем калектыву аўтараў пад кіраўніцтвам В. Д. Старычонка з'яўляецца публікацыя аб'ёмістага вучэбнага дапаможніка «Современный русский литературный язык» (2012), у якім сцісла, даступна і навукова асвятляюцца актуальныя пытанні ўсіх раздзелаў навукі пра сучасную рускую мову.

Асаблівым і, відаць, любімым клопатам В. Д. Старычонка застаецца прыкладная лексікаграфія. У канцы 1990-х – пачатку 2000-х гадоў убачыў свет шэраг выданняў для школьнікаў і абітурыентаў, аформленых у выглядзе слоўнікаў: «Беларуская літаратура: ад А да Я» (1998; 2-е выд. 2000), «Беларуская мова: ад А да Я» (2000), «Беларуская мова. Школьны слоўнік-даведнік» (2002), «Русский язык. Школьный словарь-справочник» (2002). Працягам працы па кадыфікацыі мовазнаўчай тэрміналогіі з'яўляецца фундаментальны «Большой лингвистический словарь» (2008), апублікаваны ў Растове-на-Доне.

Васіль Дзянісавіч з'яўляецца (су)аўтарам і многіх іншых лексікаграфічных выданняў. З яго ўдзелам апублікаваны энцыклапедыі і слоўнікі «Культура речи делового человека: словарь-справочник» (у суаўт.; 2003), «Культура речи и деловое общение» (у суаўт.; 2004; 2-е выд. 2008), «Беларуска-азербайджанскі слоўнік» (у суаўт.; 2015) і «Азербайджанска-беларускі слоўнік» (у суаўт.; 2017), «Энциклопедия для школьников и студентов. Русский язык» (у суаўт.; 2021) і многія інш.

Важны аб'ект навуковых інтарэсаў В. Д. Старычонка – метафаралогія. Так, у 2007 г. была апублікавана яго манаграфія «Метафара ў беларускай мове: на матэрыяле субстантываў», у якой на аснове мастацкіх і публіцыстычных твораў шасці соцень пісьменнікаў XIX–XXI стст. праведзена комплекснае даследаванне субстантыўных метафар, выяўленых у 20 тыс. кантэкставых сітуацыях.

Пасля публікацыі кнігі В. Д. Старычонак працягваў збіраць матэрыял, асэнсоўваў, сістэматызаваў, апісваў розныя аспекты мнагазначнасці слова, семантычнай структуры слова, канататыўнай варыятыўнасці, суадносін полісеміі і семантычнай дэрывацыі і інш. У выніку было апублікавана трохтомнае сачыненне «Мнагазначнасць слова ў беларускай мове» (2017), накіраванае на распрацоўку інтэграванай лінгвістычнай галіны – семантычнай дэрыватalogіі, на вывучэнне асаблівасцей другаснай намінацыі ў беларускай мове, на апрабацыю прынцыпаў і метадаў сістэмнага вывучэння спосабаў і сродкаў моўнай рэпрэзентацыі чалавека як носьбіта нацыянальнай мовы, нацыянальна-культурных каштоўнасцей, гістарычных традыцый беларускага народа.

Гэтае даследаванне В. Д. Старычонка – своеасаблівая спроба мадэлявання семантычнага фрагмента моўнай сістэмы, важны крок у асэнсаванні семантычнай варыятыўнасці, якая адлюстроўвае рэальна існуючыя факты цеснага ўзаемадзеяння мовы і пазамоўнай рэальнасці.

Васіль Дзянісавіч знаходзіць час і для вялікай грамадска-навуковай працы. Ён старшыня савета па абароне дысертацый К 02.21.01 пры БДПУ, член савета па абароне дысертацый Д 02.01.11 пры БДУ. З'яўляецца кансультантам і членам рэдакцыйных калегій часопісаў «Полымя», «Весці БДПУ», «Роднае слова», «Вучоныя запіскі», «Лингвистика Беларуси», «Кем быть? », «Kalba ir kontekstai» і інш.

Асаблівы кірунак працы прафесара В. Д. Старычонка – падрыхтоўка дактарантаў і аспірантаў. Ён з'яўляўся навуковым кансультантам па доктарскіх дысертацыях Л. Л. Плыгаўкі (2017) і Д. В. Дзятко (2022), кіраваў 13 аспірантамі і саіскальнікамі, якія сталі кандыдатамі філалагічных навук: Н. В. Яскевіч (2004), В. Ю. Шыманская (2009), Т. М. Рабава (2013), Н. У. Шульга (2014), А. М. Абдулкарым (2015), М. А. Рацько (2018), Т. А. Астапчык (2019), Д. Інь (2020), А. В. Тучынскі (2021), Аль-Баэечый Таліб Сахіб Дахан (2022), В. А. Мусіенка (2022), В. І. Жук (2023), Ю. В. Рогава (2023).

Тэматычная разнастайнасць дысертацый, напісаных пад кіраўніцтвам і пры навуковым кансультаванні В. Д. Старычонка, уражвае. У іх вывучаюцца праблемы функцыянавання заамарфічнай і безэквівалентнай лексікі, моўнай рэпрэзентацыі другасных антрапамарфічных намінацый і намінацый псіхалагічнай

сферы, канататыўных значэнняў, альфакторнага кантынуума і катэгорыі экзістэнцыі. Даследуецца таксама семантычная дэрывацыя ў сферах ментальных і дэструктыўных намінацый, пытанні рэдуплікацыі, метадалогіі лінгвістычнай тэрмінаграфіі і функцыянавання мовы ў полікультурным рэгіёне. Многія работы выкананы ў супастаўляльным аспекце – у іх аналізуецца матэрыял індаеўрапейскіх, семіцкіх, сіна-тыбецкіх моў: беларускай і рускай; беларускай і англійскай; рускай і англійскай; беларускай, рускай і англійскай; беларускай, рускай і французскай; рускай і арабскай; рускай і кітайскай; рускай і італьянскай; наямецкай і арабскай.

За шматгадовую плённую працу, значны ўклад у развіццё навуковай дзейнасці Васіль Дзянісавіч Старычонак узнагароджаны шматлікімі граматамі і Ганаровымі граматамі БДПУ, Ганаровай граматай Мінскага гарадскога выканаўчага камітэту (2002), знакам «Выдатнік адукацыі» (2004), Ганаровымі граматамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (2009, 2014), Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2014), нагрудным знакам «За ўклад у развіццё БДПУ» (2019) і многімі іншымі ўзнагародамі і заахвочваннямі. В. Д. Старычонак – уладальнік медаля і ордэна Францыска Скарыны (2010, 2014). Але ці не найбольшай узнагародай з'яўляецца любоў і павага студэнтаў, аспірантаў і дактарантаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў філалагічнага факультэта БДПУ, шанаванне і ўдзячнасць дзясяткаў даследчыкаў, працы якіх рэцэнзаваў, выпраўляў, апаніраваў і – абавязкова – падтрымліваў Васіль Дзянісавіч Старычонак.

*доктар філалагічных навук*
**Д. В. Дзятко**

***Рэктарат БДПУ, рэдакцыйная калегія і рэдакцыя часопіса «Весці БДПУ» віншуюць Васіля Дзянісавіча Старычонка з юбілеем і жадаюць далейшых творчых поспехаў у прафесійнай і грамадскай дзейнасці на карысць нашай краіны!***

ВВЦ БДПУ